View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE
provided by Belarusian State Pedagogical University Repository



УДК 930:331.105.44(476)«192»

*А.А. Дубовік,*
*аспірант кафедры гісторыі Беларусі БДПУ*

# ПРАФСАЮЗЫ БЕЛАРУСІ Ў СІСТЭМЕ САЦЫЯЛЬНА-ПРАЦОЎНЫХ АДНОСІН У ПЕРЫЯД НЭПа: ГІСТАРЫЯГРАФІЯ ПРАБЛЕМЫ

Сацыяльна-працоўныя адносіны – гэта сістэма грамадскіх адносін, што ўзнікаюць паміж людзьмі ў працэсе працоўнай і іншых форм дзейнасці па прычыне іх удзелу ў грамадскай працы. Важная роля ў ёй традыцыйна належыць прафсаюзам – самай масавай арганізацыі працоўных. Практычнае ажыццяўленне задач рэгулявання сацыяльна-працоўных адносін патрабуе глыбокага аналізу і абагульнення гістарычнага вопыту, назапашанага прафсаюзнымі органамі Беларусі ў гады новай эканамічнай палітыкі (НЭПа), калі асобныя ўмовы ў эканамічнай і працоўнай сферах былі падобныя да сённяшніх. З улікам таго, што ў гэты перыяд былі закладзены асновы многіх сучасных форм працы прафсаюзаў, складваліся перадумовы для станаўлення сацыяльнага партнёрства ў працоўнай сферы, гістарыяграфічны агляд праблемы ўдзелу прафсаюзаў у рэгуляванні сацыяльна-працоўных адносін мае не толькі тэарэтычнае, але і практычнае значэнне.

Гісторыя прафсаюзаў як самай масавай грамадскай арганізацыі была адной з вядучых тэм савецкай гістарыяграфіі. Станаўленне гістарыяграфіі прафсаюзнага руху ў савецкай краіне прыходзіцца на пачатак 20-х гг. 7 лістапада 1920 г. на заключным пасяджэнні V Усерасійскай канферэнцыі прафсаюзаў было прынята рашэнне «Аб вывучэнні гісторыі расійскага прафруху». Пры інфармацыйным аддзеле УсеЦСПС ствааралася камісія па вывучэнні гісторыі прафруху – гістпраф. Падобныя камісіі прапаноўвалася стварыць таксама пры ЦК галіновых прафсаюзаў і губернскіх саветах прафсаюзаў [1]. Работа гістпрафаў у БССР пачалася ў 1923 г., калі для збору і вывучэння матэрыялаў пры Савеце прафсаюзаў Беларусі была створана Камісія на чале з яго старшынёй Ш.Ш. Ходашам [2, с. 122].

Публікацыі аб прафсаюзах, якія выйшлі ў 20-я гг., мелі у сваёй большасці навукова-папулярны і агітацыйна-прапагандысцкі характар. Іх аўтарамі, як правіла, былі прафсаюзныя дзеячы. У працах М.П. Томскага, А.А. Андрэева і іншых кіраўнікоў расійскага прафруху рабілася спроба асэнсаваць месца прафсаюзаў у грамадстве пераходнага перыяду, змяненне іх ролі ў сувязі з прыняццем у сакавіку 1921 г. X з'ездам РКП (б) новай эканамічнай палітыкі. Прадметам разгляду ў літаратуры тых гадоў сталі ленінскае вучэнне аб задачах прафсаюзаў, функцыі і метады дзейнасці прафсаюзаў у перыяд сацыялістычнага будаўніцтва. Трэба вылучыць брашуру Н. Пятрова [3]. У ёй коратка, але паслядоўна разгледжаны такія пытанні, як стан прафсаюзаў і змяненне іх ролі з пераходам да НЭПа, арганізацыйнае будаўніцтва прафсаюзаў, абарона прафсаюзамі матэрыяльных і культурных інтарэсаў рабочага класу супраць бюракратычных скажэнняў, барацьба прафсаюзаў з эксплуатацыяй рабочых на прыватных прадпрыемствах. У шэрагу кніг і брашур, напісаных дзеячамі УсеЦСПС і Наркамата працы, разглядалася калектыўна-дагаворная і тарыфна-эканамічная работа прафсаюзаў, іх дзейнасць на прыватных прадпрыемствах, працоўныя канфлікты ў перыяд НЭПа, пытанні беспрацоўя. Аднак звесткі па БССР, як правіла, не прыводзяцца ці носяць эпізадычны характар.

Першыя публікацыі аб рабочым класе Беларусі і яго прафесійных арганізацыях, аўтарамі якіх з'яўляліся прафсаюзныя работнікі БССР Ш. Ходаш, М. Міленькі, былі нешматлікія. Яны ўяўляюць інтарэс перш за ўсё як крыніца дакладных звестак аб формах эканамічнай дзейнасці прафсаюзаў Беларусі. Заслугоўвае ўвагі зборнік, у якім даецца аналіз розных галін жыцця рэспублікі ў 1921 г., у тым ліку становішча прафсаюзаў [4]. Важнае значэнне для вывучэння гісторыі прафсаюзаў Беларусі і абагульнення вопыту работы прафсаюзных арганізацый у гады НЭПа меў выхад у свет часопіса «Прафесіянальны рух Беларусі» (выдаваўся ў 1925–1929 гг., усяго выйшла 100 нумароў). У часопісе існаваў раздзел «З мінулага», былі апублікаваны некалькі артыкулаў па гісторыі прафсаюзаў [5]. Шэраг артыкулаў і нататак былі прысвечаны тарыфна-эканамічнай і калектыўна-дагаворнай рабоце прафсаюзаў; знайшлі адлюстраванне і іншыя кірункі прафсаюзнай дзейнасці: ахова працы і сацыяльнае страхаванне, абарона інтарэсаў асобных катэгорый працоўных – жанчын, моладзі, інжынерна-тэхнічных работнікаў, праца вытворчых камісій і нарад. Яны могуць служыць крыніцай для вывучэння ролі прафсаюзаў Беларусі ў перыяд НЭПа. Асобныя артыкулы аб дзейнасці прафсаюзаў былі надрукаваны таксама ў часопісах «Бальшавік Беларусі», «Савецкае Будаўніцтва» і інш.

Аднак з канца 20-х гг. на гістарычную навуку краіны ўсё большы ўплыў, і зусім не пазітыўны, стала аказваць барацьба ў кіраўніцтве партыі за ўладу. Разгром так званага «правага ўхілу»

Рэпазіторый БДПУ

ў кіраўніцтве УсеЦСПС на чале з М.П. Томскім пачаў фактычна новы этап у асвятленні гісторыі прафсаюзнага руху. На ўсесаюзных канферэнцыях па гісторыі прафсаюзаў 1930–1931 гг. вострай крытыцы падверглася «гістпрафаўская спадчына». Былых лідараў савецкага прафруху і актыўных дзеячаў гістпрафаў абвінавацілі ў імкненні супрацьпаставіць прафсаюзы камуністычнай партыі, у «трэд-юніянізме», у прапаведванні меншавіцкіх установак і адыходзе ад ленінскага вучэння. «Навука» аб прафсаюзах фактычна звялася да цытавання выказваннняў У.І. Леніна і І.В. Сталіна. Доўгі час вопыт работы прафсаюзаў ва ўмовах НЭПа практычна не вывучаўся, а ідэолагі і практыкі «новага курсу» прафсаюзаў М.П. Томскі і іншыя былі аднесены да «ворагаў народа». Само слова «трэд-юніянізм» стала лаянкавым у вуснах прыхільнікаў камандна-адміністрацыйнай сістэмы. З ліквідацыяй у 1930 г. гістпрафаў распрацоўка праблем прафсаюзнага руху у рэспубліцы сканцэнтравалася ў Інстытуце гісторыі партыі і Кастрычніцкай рэвалюцыі пры ЦК КП(б)Б і Інстытуце гісторыі АН БССР. Але ў 30-я гг. у гістарычнай навуцы пад уплывам фарміравання аўтарытарнай сістэмы кіравання краінай і грамадствам нарасталі адмоўныя з’явы. Рэзка паменшылася колькасць апублікаваных навуковых прац. Абсалютная большасць з іх насіла агітацыйна-прапагандысцкі характар.

Агульнае зніжэнне навуковай цікавасці да праблем НЭПа ў гістарыяграфіі 30–50-х гг. выявілася ў тым, што ў гэты перыяд не выйшла значная колькасць работ як беларускіх, так і агульнасаюзных, прысвечаных дзейнасці прафсаюзаў у 20-я гг. Пераважалі артыкулы практычнага характару аб розных формах эканамічнай работы прафсаюзаў. Пры гэтым дзейнасць вытворчых нарад і камісій была мэтай абмеркавання як аднаго з этапаў падрыхтоўкі масавага сацыялістычнага спаборніцтва. Праблема працоўных канфліктаў на фабрыках і заводах савецкай краіны наогул не разглядалася ў працах даследчыкаў. Падобны факт не сцвярджае аб знікненні актуальнасці дадзенай праблемы. Істотнай прычынай замоўчвання вострых праблем у працоўных адносінах стала нежаданне паказаць хібы, слабыя месцы ў сацыяльнай палітыцы савецкай дзяржавы. Такім чынам, даследаванні гэтага этапу гістарыяграфіі былі арыентаваны на вузкапрагматычныя задачы – абгрунтаванне правільнасці курсу камуністычнай партыі на «згортванне» НЭПа і ажыццяўленне фарсіраванай індустрыялізацыі ў СССР.

Другі этап у гістарыяграфіі прафсаюзнага руху краіны і рэспублікі пачаўся пасля XX з’езда КПСС (люты 1956 г.). Дэмакратызацыя грамадскага жыцця садзейнічала павышэнню ролі прафсаюзаў у гаспадарчым і культурным будаўніцтве і стварыла спрыяльныя ўмовы для творчага пошуку гісторыкаў. У 1958 г. А.П. Купрэевай была абаронена кандыдацкая дысертацыя па спецыяльнасці «Гісторыя СССР» на тэму «Прафсаюзы Беларусі ў барацьбе за выкананне пяцігадовага плана ў галіне прамысловасці (1928–1932 гг.)», але разглядаецца ў ёй дзейнасць прафсаюзаў у час, калі ўжо фактычна адбылося згортванне НЭПа. У кандыдацкай дысертацыі А.Р. Гарбачова, абароненай у 1960 г., аналізуецца пераход БССР да НЭПа, аднак прафсаюзы толькі згадваюцца аўтарам у раздзеле, дзе гаворка ідзе аб удасканальванні работы партыйнага і савецкага апарату [6].

У апублікаванай у 1967 г. манаграфіі М.Я. Завалеева па гісторыі рабочага класа Беларусі знайшла адлюстраванне і дзейнасць прафсаюзаў у перыяд сацыялістычнага будаўніцтва, у тым ліку ў гады НЭПа [7]. Асноўная ўвага аўтара звернута на вытворчую працу прафсаюзаў. У кнізе прыводзіцца багаты фактычны матэрыял, але маюцца і асобныя недакладнасці адносна гісторыі калектыўных дагавораў і колькасці вытворчых нарад і камісій у БССР. Дзейнасць апошніх разгледжана і ў яго артыкуле [8]. Паказаны ў асноўным станоўчыя вынікі работы вытворчых нарад, хаця ў ёй было шмат недахопаў: нерэгулярнае скліканне, слабы ўлік паступленняў і кантроль за рэалізацыяй прапаноў. Выявіць аб’ектыўныя прычыны, якія абумовілі даволі нізкую эфектыўнасць такой формы ўдзелу рабочых у кіраванні, аўтар не змог.

Знамянальнай падзеяй у гістарыяграфіі прафсаюзаў рэспублікі з’явіўся выхад з друку ў 1970 г. пад рэдакцыяй старшыні Белсаўпрофа І.М. Макарава калектыўнай працы «Нарысы гісторыі прафсаюзаў Беларусі (1905–1969)» – першага даследавання, у якім давалася сістэматычнае храналагічнае асвятленне гісторыі дзейнасці прафсаюзаў рэспублікі. Аўтарамі кнігі сталі вучоныя Інстытута гісторыі АН БССР і прафсаюзныя работнікі. Главы IV і V кнігі, напісаныя кандыдатам гістарычных навук М.Я. Завалеевым, раскрываюць дзейнасць прафсаюзаў у перыяды аднаўлення народнай гаспадаркі (1921–1925 гг.) і пабудовы фундамента сацыялістычнай эканомікі (1926–1932 гг.). Але ўдзел прафсаюзаў у рэгуляванні сацыяльна-працоўных адносін у перыяд НЭПа не атрымаў у гэтых главах належнага асвятлення. Аднак у кнізе адсутнічаюць спасылкі на крыніцы, акрамя як на працы класікаў марксізму.

У 70–80-я гг. дзейнасць прафсаюзаў Беларусі даследавалася асабліва актыўна і плённа. Апублікаваны шэраг манаграфій, шмат артыкулаў і абаронена некалькі дысертацый, аднак прысвечаных галоўным чынам пасляваеннаму перыяду гісторыі прафсаюзаў. Разам з тым, у кандыдацкай дысертацыі Л.І. Папова, абароненай у 1971 г., разглядаецца дзейнасць Кам-

Рэпазіторый БДПУ

партыі Беларусі па павышэнні ролі прафсаюзаў у аднаўленні прамысловасці ў 1921–1925 гг. [9]. Аўтар паказаў узмацненне партыйнага кіраўніцтва прафсаюзамі і перабудову іх работы ў сувязі з пераходам да НЭПа, кіраўніцтва КП(б)Б дзейнасцю прафсаюзаў па выхаванні сацыялістычнай дысцыпліны працы, уцягненні рабочых у арганізацыю і кіраванне вытворчасцю, па павышэнні матэрыяльнага і культурнага ўзроўню рабочага класа. Даследчык прыводзіць шматлікія факты, якія раскрываюць розныя кірункі дзейнасці прафсаюзаў у 1920–1925 гг. Але акцэнт у дысертацыйнай рабоце робіцца на партыйным кіраўніцтве прафсаюзамі, што разглядаецца як галоўная ўмова павышэння іх ролі ў гаспадарчым і культурным будаўніцтве ў перыяд аднаўлення прамысловасці ў 1921–1925 гг. Многа месца адведзена ў дысертацыі крытыцы «трацкізму» (такі падыход быў традыцыйным для таго часу). Арганізацыйнае ўмацаванне прафсаюзаў аўтар прасочвае праз рост удзельнай вагі камуністаў у прафсаюзных органах, іншыя яго паказчыкі, напрыклад, адукацыйны ўзровень прафсаюзных кадраў, не разглядаецца. У дысертацыі вельмі мала ўвагі надаецца калектыўна-дагаворнай рабоце прафсаюзаў, іх дзейнасці па вырашэнні канфліктаў, фактычна яны толькі ўпамінаюцца. Зусім не знайшлі месца ў дысертацыі пытанні працы прафсаюзаў з інжынерна-тэхнічнай інтэлігенцыяй, сельскім пралетарыятам. Дзейнасць прафсаюзаў па павышэнні творчай актыўнасці рабочага класа ў перыяд аднаўлення народнай гаспадаркі разглядаецца і ў артыкуле У.Д. Якутава [10].

Кандыдацкая дысертацыя У.М. Якубоўскага, абароненая ў 1979 г., прысвечана дзейнасці прафсаюзаў БССР па падняцці матэрыяльнага і культурнага дабрабыту рабочага класа ў гады рэканструкцыі народнай гаспадаркі (1926–1937 гг.). Яго ж манаграфія, якая ўбачыла свет у 1986 г., падрабязна раскрывае дзейнасць прафсаюзаў па павышэнні ўзроўню жыцця рабочага класа рэспублікі ў 1926–1941 гг. [11]. Такім чынам, аўтарам даследуецца дзейнасць прафсаюзаў, пачынаючы толькі з часоў згортвання НЭПа. Спецыфіка работы прафсаюзаў Беларусі ў перыяд НЭПа не разглядаецца, паколькі акцэнт вучоным робіцца на важнасці рэканструкцыйнага перыяду для паляпшэння ўзроўню жыцця рабочага класа.

Гісторыя прафсаюзнага руху ў перыяд НЭПа знайшла пэўнае асвятленне ў калектыўных працах па гісторыі Беларусі, з якіх трэба перш за ўсё вылучыць трэці том пяцітомнай кнігі «Гісторыя Беларускай ССР» (Мінск, 1973 г.) і другі том – «Гісторыя рабочага класа Беларускай ССР» у чатырох тамах (1985 г.), падрыхтаваных вучонымі Інстытута гісторыі АН БССР. Але дзейнасці прафсаюзаў у сферы працоўных адносін у гэтых навуковых працах адведзена недастаткова месца. Работа арганізацый прафсаюза сельскагаспадарчых і лясных рабочых у вёсцы знайшла пэўнае адлюстраванне ў манаграфіі (1979 г.) і доктарскай дысертацыі А.М. Сарокіна, прысвечаных стварэнню і дзейнасці саўгасаў у БССР у 1917–1941 гг. У дысертацыі М.А. Апімаха паказана барацьба савецкай дзяржавы за ліквідацыю беспрацоўя ў Беларусі [12], у брашуры І.Я. Івашненкі – дзейнасць партыйных, гаспадарчых і прафсаюзных арганізацый па кіраванні прамысловай вытворчасцю ў аднаўленчы перыяд 1921–1925 гг. [13]. Пэўнае значэнне маюць таксама навуковыя працы па гісторыі народнай гаспадаркі Беларусі, у прыватнасці прамысловасці ў гады НЭПа [14–15]. Дзейнасць прафсаюзаў у іх спецыяльна не разглядаецца, аднак яны дапамагаюць зразумець асноўныя тэндэнцыі эканамічнага развіцця рэспублікі ў гэты перыяд.

Большасці гістарычных навуковых прац былі ўласцівы недахопы, характэрныя для тых гадоў: строгае прытрымліванне партыйных установак, недастатковая глыбіня навуковага даследавання, адлюстраванне толькі поспехаў і дасягненняў, замоўчванне нявырашаных праблем і хібаў у дзейнасці прафсаюзаў. Так, характэрнай асаблівасцю асвятлення ў савецкай гістарыяграфіі працоўных канфліктаў перыяду НЭПа з'яўлялася акцэнтаванне ўвагі на негатыўных момантах становішча рабочых на прыватных прадпрыемствах, якія разглядаліся выключна з пазіцый тэорыі класавай барацьбы. Замоўчваўся той факт, што заработная плата на прыватных прадпрыемствах была часам вышэйшая, чым на аналагічных дзяржаўных, ды і цяжкасці ў заключэнні калектыўных дагавораў таксама часта мелі месца на прадпрыемствах, якія падпарадкоўваліся ВСНГ БССР. Распрацоўка гісторыі прафсаюзнага руху ажыццяўлялася ў цеснай сувязі з гісторыяй партыі. Увагу даследчыкаў прыцягвалі ў першую чаргу праблемы партыйнага кіраўніцтва прафсаюзамі.

У другой палове 1980-х гг. падчас «перабудовы» значна павялічылася колькасць даследаванняў па гісторыі НЭПа і прафсаюзнага руху, узрасла аб'ектыўнасць ацэнак. Менавіта адчуванне гістарычнага падабенства эканамічнай палітыкі 1920-х гг. і другой паловы 1980-х – пачатку 1990-х гг. стала прычынай рэзкага павелічэння цікавасці да НЭПа з боку прадстаўнікоў усіх грамадскіх навук. Як заўважыў расійскі гісторык І.Б. Арлоў, у НЭПе бачылі «рэальны шлях выхаду з эканамічнага і палітычнага тупіка, у якім аказалася краіна» [16, с. 104]. Адсюль моцнае імкненне даследчыкаў мяжы 1980–1990-х гг. знайсці ў эканамічнай палітыцы 20-х гг. тэндэнцыі, падобныя да тых, што яны назіралі ў сучаснай ім рэальнасці. Аднак якасны прарыў у даследаванні праблем

Рэпазіторый БДПУ

прафсаюзнага руху ў перыяд НЭПа наступіў толькі з пачатку 1990-х гг., калі перад гістарычнай навукай адкрыліся новыя даследчыцкія магчымасці, што было звязана з грамадска-палітычнымі пераменамі ў краіне.

Трэці этап айчыннай гістарыяграфіі гісторыі прафсаюзаў ахоплівае перыяд 90-х гг. XX ст. – пачатак XXI ст. Ён характарызуецца тым, што з абвяшчэннем дзяржаўнага суверэнітэту савецкіх рэспублік, распадам СССР, фарміраваннем грамадзянскай супольнасці і прававой дзяржавы пачалося канцэптуальнае пераасэнсаванне айчыннай гісторыі, пераадоленне ідэалагічных абмежаванняў, уласцівых савецкай гістарыяграфіі. Сталі з'яўляцца навуковыя працы, напісаныя з выкарыстаннем новых крыніц, архіўных матэрыялаў, свабодных ад класавых і партыйных прыярытэтаў. У змяніўшыхся ўмовах прымаюцца спробы рэалізацыі сучасных падыходаў у вывучэнні гісторыі прафсаюзаў Беларусі. Пры гэтым абазначылася тэндэнцыя амаль поўнай адмовы ад даследавання праблем, звязаных з дзейнасцю камуністычнай партыі, ажыццяўленнем яе кіруючай ролі ў грамадстве. На сучасным этапе тэматыка партыйнага кіраўніцтва прафсаюзамі наогул знікла з поля зроку гісторыкаў.

Асноўным у постсавецкай гістарыяграфіі трэба прызнаць вывад аб глыбокай памылковасці ажыццёўленага І.В. Сталіным на рубяжы 1920–1930-х гг. перавароту ў дзейнасці прафсаюзаў. Удалая спроба асвятлення палітычнай барацьбы, што разгарнулася ў 1928–1929 гг. паміж старшынёй УсеЦСПС М.П. Томскім і генеральным сакратаром ЦК ВКП(б) І.В. Сталіным, зроблена расійскім гісторыкам А.І. Гарэлавым [17]. У гэтай і іншых працах паказана ператварэнне прафсаюзаў у дадатак дзяржаўнага апарату ў сувязі з фарміраваннем у СССР камандна-адміністрацыйнай сістэмы. Разам з тым, некаторыя з сучасных гісторыкаў працягваюць настойваць на неабходнасці выканання прафсаюзамі вытворчых функцый, бо, на іх погляд, эфектыўная абарона інтарэсаў рабочых немагчыма без удзелу прафсаюзаў у сістэме кіравання вытворчасцю.

У апошнія гады ў Расіі выйшлі грунтоўныя працы па гісторыі працоўных адносін у СССР у 1920-я гг. Перш за ўсё заслугоўвае ўвагі манаграфія Л.В. Барысавай [18]. Аўтар падрабязна разглядае партыйна-дзяржаўную палітыку ў сферы працоўных адносін падчас «ваеннага камунізму» і НЭПа. Але ў кнізе фактычна адсутнічаюць канкрэтныя факты, якія датычацца Беларусі. Напісана яна на матэрыялах Расійскай Федэрацыі. Сацыяльна-працоўныя адносіны ў перыяд НЭПа сталі аб'ектам даследавання ў кандыдацкай дысертацыі С.В. Халіулінай [19]. Аўтар справядліва лічыць, што вызначальнае значэнне для характарыстыкі ўсёй сістэмы сацыяльна-працоўных адносін мае група адносін у сферы працаўладкавання, заключэння калектыўнага дагавора, а таксама адносіны, звязаныя з аплатай працы і ўдзелам у прыняцці кіраўніцкіх рашэнняў на вытворчасці. Заслугоўвае ўвагі і зборнік, у якім разглядаюцца працоўныя канфлікты ў савецкай Расіі ў 1918–1929 гг. і прыводзяцца асобныя факты забастовак у БССР [20].

Актуальнай застаецца тэматыка новай эканамічнай палітыкі, яе ролі ў развіцці краіны. Неабходнасць прыняцця НЭПа, праблемы, рашэнні, супярэчнасці сталі ў 1999 г. прадметам грунтоўнага даследавання ў манаграфіі вядомага беларускага вучонага-эканаміста У.Р. Гусакова (з 2013 г. Старшыня Прэзідыума НАН Беларусі). Напісана яна ў асноўным на матэрыялах сельскай гаспадаркі [21]. Беларуская вёска ў першыя гады НЭПа (1921–1923 гг.) даследуецца ў манаграфіі М.А. Бяспалай (1999 г.), па дадзенай тэме ёй абаронена доктарская дысертацыя, дзе хроналагічныя рамкі пашыраны да 1927 г. Гэтыя навуковыя працы маюць вялікае метадалагічнае значэнне для ацэнкі поспехаў і супярэчнасцей НЭПа ў Беларусі. Так, М.А. Бяспалая не падтрымала афіцыйную канцэпцыю савецкіх гісторыкаў аб выключна пазітыўнай ролі НЭПа ў эканамічным жыцці вёскі. На яе думку, НЭП у беларускай вёсцы ў асноўным праявіўся ў выглядзе падатковай палітыкі, якая не адпавядала эканамічным магчымасцям вёскі і не садзейнічала станоўчым перспектывам эканамічнага равіцця [22, с. 13]. Разам з тым, дзейнасць прафсаюзаў У.Р. Гусаковым і М.А. Бяспалай фактычна не разглядаецца, паколькі сяляне ў той час не з'яўляліся членамі прафсаюза.

Новыя падыходы ў вывучэнні гісторыі знайшлі месца ў выданні «Нарысы гісторыі Беларусі» у дзвюх частках (1995 г.). Раздзел IX кнігі носіць назву «Ва ўмовах новай эканамічнай палітыкі». У ім паказаны аднаўленне і развіццё на рэйках НЭПа прамысловасці і сельскай гаспадаркі, тэндэнцыі грамадска-палітычнага жыцця, палітыка беларусізацыі. Грамадска-палітычнае жыццё ў перыяд НЭПа, становішча саветаў і грамадскіх арганізацый у 20–30-я гг. атрымала асвятленне і ў пятым томе шасцітомнай кнігі «Гісторыя Беларусі» (2007 г.), дзе справядліва адзначаецца, што прафсаюзы з'яўляліся найбольш масавай арганізацыяй і «дзякуючы значнай распаўсюджанасці на прадпрыемствах прафсаюзныя арганізацыі аказвалі пэўны ўплыў на вытворчую і сацыяльную сферы. У пачатку і сярэдзіне 20-х гг. гэты ўплыў быў дастаткова эфектыўны, таму што ва ўмовах адносна нэпаўскай дэмакратыі жыццё прафсаюзных арганізацый праходзіла на пэўнай дэмакратычнай аснове. У канцы 20-х гг. у сувязі з агульным партыйна-дзяржаўным курсам на ўвядзенне ўнітар-

Рэпазіторый БДПУ

ных метадаў кіравання грамадствам гэта ўсё больш пачало адбівацца і на дзейнасці прафсаюзаў. Яны цясней сталі прывязвацца да партыйна-дзяржаўнай улады. Узмацнілася тэндэнцыя іх адзяржаўлення, прапанаваная Л. Троцкім яшчэ ў пачатку 20-х гг. Гэта значна звузіла поле дзейнасці прафсаюзных ячэек і магчымасці праяўлення ініцыятывы працоўных» [23, с. 201]. Больш падрабязнае асвятленне працэс адзяржаўлення грамадскіх арганізацый знайшоў у працах акадэміка НАН Беларусі М.П. Касцюка [24] і кандыдата гістарычных навук Т.С. Процькі [25], прысвечаных станаўленню таталітарнай сістэмы ў БССР у даваенны перыяд.

Асноўныя вехі гістарычнага шляху прафсаюзнага руху краіны дае магчымасць прасачыць абагульняльны артыкул «Прафесійныя саюзы» ў «Энцыклапедыі гісторыі Беларусі» (Т. 5, 1999 г.). Гісторыя прафсаюзаў у перыяд НЭПа знайшла пэўнае адлюстраванне таксама ў кнізе П.Г. Давідзюка [26], матэрыялах рэспубліканскіх і рэгіянальных канферэнцый, артыкулах у часопісе «Труд. Профсоюзы. Общество» [27]. Вялікая ўвага ў апошнія гады надаецца даследаванню сацыяльнага партнёрства як практыкі ўзаемадзеяння прафсаюзаў, дзяржавы і аб'яднанняў наймальнікаў. Гістарычныя аспекты сацыяльнага партнёрства, у тым ліку яго элементы ў выглядзе калектыўна-дагаворнай работы ў перыяд НЭПа, разглядаюцца ў артыкуле Б.Б. Сінькова [28]. Артыкул У.М. Якубоўскага прысвечаны гісторыі сацыяльнага страхавання ў Беларусі ў перыяд індустрыялізацыі [29].

У выніку вялікай працы, праведзенай у ходзе падрыхтоўкі да святкавання 100-годдзя прафсаюзнага руху Беларусі, у 2005 г. убачыла свет калектыўная манаграфія [30], у якой выкладзена гісторыя айчыннага прафсаюзнага руху з часоў з'яўлення ў канцы XIX ст. у заходніх губернях Расійскай імперыі першых прафсаюзаў і да нашых дзён. У гэтай працы асвятляюцца розныя кірункі дзейнасці прафсаюзаў, у тым ліку ў перыяд НЭПа, падрабязна раскрыты ход дыскусіі ў партыі аб прафсаюзах, паказана дзейнасць прафсаюзаў па абароне працоўных правоў работнікаў, але даследавана грунтоўна калектыўна-дагаворная работа прафсаюзаў, іх удзел ў вырашэнні працоўных канфліктаў. Па-ранейшаму прыводзіцца бяздоказны тэзіс аб тым, што першы калектыўны дагавор у Беларусі быў заключаны ў пачатку 1922 г. паміж прафсаюзам хімікаў і групавым упраўленнем шкляной прамысловасці. Аднак у кнізе, прэзентаванай выдаўцамі як навуковае выданне, няма спасылак на выкарыстаныя крыніцы, хаця ў канцы калектыўнай манаграфіі змешчаны спіс асноўных крыніц і літаратуры па гісторыі прафсаюзаў Беларусі.

Наступным крокам вывучэння гісторыі прафсаюзаў стаў выхад у 2007 г. кнігі [31], у якой прадстаўлена гісторыя рэспубліканскіх галіновых прафсаюзаў, а таксама абласных прафсаюзных аб'яднанняў. Асобныя факты адносяцца да перыяду НЭПа. Падрыхтаваны і надрукаваны таксама калектыўныя працы па гісторыі прафсаюзаў асобных абласцей рэспублікі. Так, у працы А.Р. Агеева і І.А. Пушкіна (Магілёў, 2005) прыводзяцца некаторыя статыстычныя звесткі аб дзейнасці прафсаюзаў Магілёўшчыны ў 1920-я гг.

Важнай падзеяй стаў выхад у свет у 2011–2012 гг. двухтомнай энцыклапедыі «Прафесійныя саюзы Беларусі», у шматлікіх артыкулах якой асветлены праблемы гісторыі прафсаюзаў рэспублікі, прыведзены біяграфічныя звесткі аб прафсаюзных дзеячах. Энцыклапедыя падрыхтавана вялікім аўтарскім калектывам, у склад якога ўваходзіў і аўтар гэтага артыкула. Аднак у энцыклапедычным выданні адсутнічае спецыяльны артыкул аб новай эканамічнай палітыцы і дзейнасці прафсаюзаў у гэты перыяд, тады як артыкулы аб індустрыялізацыі, калектывізацыі і рабоце прафсаюзаў Беларусі па іх ажыццяўленні адлюстроўваюць пазначаныя пытанні.

Такім чынам, у гістарыяграфіі гісторыі прафсаюзнага руху Беларусі ў перыяд НЭПа можна вылучыць тры этапы: 1) 1921 г. – сярэдзіна 1950-х гг.; 2) другая палова 50 – канец 80-х гг.; 3) пачатак 90-х гг. – наш час. Кожны з іх характарызаваўся асаблівасцямі, звязанымі з тэматычнай накіраванасцю даследаванняў, глыбінёй распрацоўкі праблемы. Пры гэтым вывучэнне гісторыі прафсаюзаў Беларусі было цесна звязана з гістарыяграфіяй расійскіх прафсаюзаў, паколькі на працягу доўгага часу яны дзейнічалі ў складзе адзінай дзяржавы. Ацэньваючы ў цэлым гістарыяграфію прафсаюзаў Беларусі, неабходна адзначыць, што даследчыкамі праведзена значная работа па распрацоўцы многіх праблем прафсаюзнага руху. Сабраны багаты фактычны матэрыял, выдадзены манаграфіі і артыкулы. У той жа час вышэйпазначанае толькі паклала пачатак глыбокаму вывучэнню гісторыі прафсаюзаў рэспублікі. Ёсць прабелы ў вывучэнні асобных перыядаў гістарычнага шляху прафсаюзаў, у тым ліку ў гады НЭПа. Дзейнасць прафсаюзаў Беларусі ў гэты перыяд, іх месца і роля ў рэгуляванні сацыяльна-працоўных адносін не стала прадметам спецыяльнага манаграфічнага даследавання. На наш погляд, існуе неабходнасць стварэння новых буйных, абагульняльных прац па гісторыі прафсаюзаў, у якіх бы аб'ектыўна, без упрыгожвання, але і без ачарнення асвятляўся гістарычны шлях прафсаюзнага руху Беларусі, у тым ліку ў перыяд НЭПа.

### Літаратура і крыніцы


1. *Игнатенко, Т.А.* Истпрофы и их роль в советской историографии профессионального рабочего движения / Т.А. Игнатенко // Исторические записки. – 1979. – Т. 104. – С. 240–247.


Рэпазіторый БДПУ

2. Отчет о деятельности Президиума Совета профсоюзов Белоруссии (апрель 1922 – июнь 1923 г.). – Минск, 1923. –126 с.
3. *Петров, Н.* НЭП и профсоюзы / Н. Петров. – М.; Л.: Молодая гвардия, 1926. – 46 с.
4. Советская Белоруссия. – Минск: Гос. изд-во ССРБ, 1921. – 307 с.
5. *Фёдараў.* Дзесяць год прафсаюзнай работы / Фёдараў // Прафесіянальны рух Беларусі. –1929. – № 1. – С. 6–11.
6. *Горбачев, А.Р.* Переход Советской Белоруссии к новой экономической политике (1921–1922): автореф. дис. … канд. ист. наук: 07.00.02 / А.Р. Горбачев; АН БССР. – Минск, 1960. – 22 с.
7. *Завалеев, Н.Е.* Рабочий класс Белоруссии в борьбе за социализм (1917–1932) / Н.Е. Завалеев. – Минск: Наука и техника, 1967. – 314 с.
8. *Завалееў, М.Я.* Узнікненне і дзейнасць вытворчых нарад у Беларусі ў аднаўленчы перыяд (1921–1925 гг.) / М.Я. Завалееў // Весці Акадэміі навук БССР. Сер. грамад. навук. – 1966. – № 4. – 54–63.
9. *Попов, Л.И.* Деятельность Компартии Белоруссии по повышению роли профсоюзов в восстановлении промышленности (1921–1925 гг.): автореф. дис. ... канд. ист. наук; 07.570 – история КПСС / Л.И. Попов; ИИП при ЦК КПБ. – Минск, 1971. – 22 с.
10. *Якутаў, У.Д.* Прафсаюзы Беларусі і павышэнне творчай актыўнасці рабочага класа (1921–1925 гг.) / У.Д. Якутаў // Весці Акадэміі навук БССР. Сер. грамад. навук. 1980. – № 5. – С. 67–76.
11. *Якубовский, В.Н.* Деятельность профсоюзов БССР по повышению уровня жизни рабочего класса (1926–1941 гг.) / В.Н. Якубовский. – Минск: Наука и техника, 1986. – 124 с.
12. *Опимах, Н.А.* Ликвидация безработицы в Советской Белоруссии (1917–1930 гг.): автореф. дис. … канд. ист. наук / Н.А. Опимах; АН БССР, Институт истории. – Минск, 1970. – 30 с.
13. *Ивашненко, И.Е.* Промышленность БССР в восстановительный период (1921–1925 гг.) / И.Е. Ивашненко. – Минск: Беларусь,1971. – 120 с.
14. *Крутилина, Т.Н.* Развитие промышленности Белоруссии в восстановительный период (1921–1925/26 годы): автореф. дис. … канд. экон. наук / Т.Н. Крутилина; АН БССР, Институт экономики. – Минск, 1967. – 21 с.
15. Развитие экономики Белоруссии в 1921– 1927 гг. / под ред. Ф.С. Мартинкевича, В.И. Дрица. – Минск: Наука и техника, 1973. – 332 с.
16. *Орлов, И.Б.* НЭП в региональном ракурсе: от усредненных оценок к многообразию / И.Б. Орлов // НЭП: экономические, политические и социокультурные аспекты. – М., 2006.
17. *Горелов, О.И.* Цугцванг М. Томского / О.И. Горелов. – М.: РОССПЭН, 2000. – 288 с.
18. *Борисова, Л.В.* Трудовые отношения в Советской России (1918–1924 гг.) / Л.В. Борисова. – М.: Собрание, 2006. – 288 с.
19. *Халиуллина, С.В.* Развитие социально-трудовых отношений в период НЭПа: автореф. дис. ... канд. ист. наук / С.В. Халиуллина; РАГС. – М., 2002. – 25 с.
20. Трудовые конфликты в Советской России 1918–1929 гг. / под ред. Ю.И. Кирьянова, В. Розенберга, А.Н. Сахарова. – М.: Эдиториал, 1998. – 360 с.
21. *Гусаков, В.Г.* НЭП: необходимость, проблмы, противоречия / В.Г. Гусаков. – Минск: БелНИИЭИ АПК, 1999. – 167 с.
22. *Бяспалая, М.А.* Беларуская вёска ў 1921–1927 гг.: аўтарэф. дыс. ... д-ра гіст. навук / М.А. Бяспалая; БДПУ. – Мінск, 1999. – 39 с.
23. Гісторыя Беларусі: у 6 т. Т. 5. Беларусь у 1917–1945 гг. / А. Вабішчэвіч [і інш.]; рэдкал. М. Касцюк (гал. рэд. ) і інш. – Мінск: Экаперспектыва, 2007. – 213 с.
24. *Касцюк, М.П.* Бальшавіцкая сістэма ўлады на Беларусі / М.П. Касцюк. – Мінск: ВП «Экаперспектыва», 2000. – 307 с.
25. *Протько, Т.С.* Становление советской тоталитарной системы в Беларуси (1917–1941 гг.) / Т.С. Протько. – Минск: Тесей, 2002. – 686 с.
26. *Давидюк, П.Г.* Профсоюзное движение: история, теория, практика / П.Г. Давидюк. – Минск: МИТСО, 1999. – 269 с.
27. *Дубовик, А.К.* Из истории профсоюзного движения сельских тружеников Беларуси / А.К. Дубовик // Труд. Профсоюзы. Общество. – 2004. – № 1. – С. 11–19.
28. *Сінькоў, Б.Б.* Калектыўна-дагаворнае рэгуляванне працоўных адносін у Беларусі / Б.Б. Сінькоў // Беларускі гістарычны часопіс. – 2006. – № 5. – С. 6–11.
29. *Якубовский, В.Н.* Деятельность профсоюзов Беларуси по организации социального страхования трудящихся в годы индустриализации (1926–1941 гг.) / В.Н. Якубовский // Труды Минского института управления. – 2008. – № 2. – С. 152–155.
30. История профсоюзного движения Беларуси / П.Г. Давидюк [и др.]; под ред. Л.П. Козика. – Минск: ФУАинформ, 2005. – 416 с.
31. Профессиональные союзы Беларуси: история и современность / под ред. Л.П. Козика. – Минск: ФПБ, 2007. – 672 с.



*Summary*

*The article gives historiographical overview and evaluation of the problem of the Belarus trade union activity in the system of social and labor relations in the period of new economic policy. Three stages of historiography of trade unionism in the NEP period (1921 – the mid-1950s; the second half of the 1950s – end of the 1980s; modern, from the beginning of the 1990s) are highlighted in the article. It is noted that the study of the history of trade unions of Belarus was closely connected with the Russian trade union historiography, because for a long period of time they worked in the same state. In the Soviet period the attention of researchers was attracted to the problem of the party leadership of trade unions. It is shown that the trade union operating activities are better investigated than their collective contract work and participation in solving labor conflicts in Belarus. It is stated that the role of trade unions in Belarus in the regulation of social and labor relations in the NEP period has not yet become the subject of special monographic study.*


Паступіў у рэдакцыю 04.04.2014 г.

---

*УДК 94(476)«192/196»:[364.4:331]-056.262*

***К.В. Скрынник,***
*аспирант кафедры истории Беларуси БГПУ*

# СОЦИАЛЬНО-ТРУДОВАЯ РЕАБИЛИТАЦИЯ ИНВАЛИДОВ ПО ЗРЕНИЮ В БССР В 20–60-е гг. ХХ в.

Социально-трудовая реабилитация инвалидов по зрению в БССР проводилась преимущественно в системе Белорусского общества слепых (БелОС).

Созданное 23 ноября 1924 г. по инициативе самих незрячих как самодеятельная общественная организация и утвержденное Постановлением Центрального исполнительного комитета и Совета народных комиссаров БССР 29 марта 1928 г. [1], встроившим ее в систему Народного комиссариата социального обеспечения БССР, Белорусское общество слепых ставило своей целью выявление и объединение слепых и оказание им всесторонней помощи во всех сфе-

Рэпазіторый БДПУ